**Алесь СМОЛІК,**
**Сымон БАРЫС**

# Сацыяльная структура грамадства ВКЛ (XV--XVI стст.)

## Станы (саслоўі) і класы

Адной з важных задач, якія стаяць перад выкладчыкам гісторыі Беларусі, з'яўляецца высвятленне пытання аб сацыяльнай структуры грамадства Вялікага княства Літоўскага.

Матэрыял прапануемай камп'ютэрнай праграмы дае магчымасць студэнту на семінарскіх або індывідуальных занятках прасачыць працэс утварэння і развіцця феадальных саслоўяў, іх становішча ў грамадстве, наяўнасць прывілеяў і павіннасцей.

Для вызначэння саслоўяў ужываўся ў той час тэрмін *"станы"*. Паводле Статута ВКЛ 1588 г., былі свецкія (служылыя), духоўныя і простыя станы. Пакажам саслоўны склад насельніцтва ВКЛ на схеме.

**Станавы (саслоўны) склад насельніцтва ВКЛ**






У Вялікім княстве Літоўскім у XIV—XVI стст. панаваў феадальны грамадскі лад. Па сваёй сацыяльнай структуры грамадства падзялялася на два асноўныя класы: **феадалаў-землеўласнікаў і залежных сялян.** Апрача таго, у вёсках і гарадах у XIV—XV стст. жыло нямала людзей, якія лічыліся асабіста свабоднымі. Але колькасць свабодных людзей у XVI ст. у вёсках змяншаецца.

Паколькі земляробства было асновай эканамічнага развіцця, наяўнасць і памеры ўчасткаў зямлі вызначалі сацыяльнае становішча свабодных людзей. Страта свабоды прыводзіла чалавека ў ніжэйшую сацыяльную групу.

У праграме даецца поўная характарыстыка асноўных класаў. Яна ўтрымлівае тэкставы і графічны матэрыял, які дае магчымасць студэнтам азнаёміцца з рознымі сацыяльнымі групамі.

### Феадалы

***Найбуйнейшым уласнікам зямлі была дзяржава ў асобе вялікага князя.*** Значная частка зямлі знаходзілася ў спадчынным карыстанні князёў і шляхты.

Прыкладна да сярэдзіны XVI ст. падзелу гаспадарскіх зямель на дзяржаўныя і асабісты дамен вялікага князя не існавала. Дамен вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста быў створаны ў 1548—1572 гг. Затым на каранацыйным Сойме 1588 г. для задавальнення патрэб двара вялікага князя са складу дзяржаўных уладанняў былі выдзелены так званыя сталовыя маёнткі, якія ў далейшым сталі называцца *эканоміямі*. На Беларусі існавалі Берасцейская, Гародзенская, Кобрынская, Магілёўская, Лідская, Пінская і Слонімская эканоміі. Яны падзяляліся на *валасці, войтаўствы* і *ключы*.

Гаспадарскія землі, якія дзяліліся на *дзяржавы* і *старостны*, раздаваліся феадалам у часовае карыстанне за службу.

***Формамі набыцця феадальнага землеўладання былі вотчына, купля і заклад.***

Клас феадалаў падраздзяляўся на групы, якія можна паказаць схематычна.

**Склад феадалаў у ВКЛ**






РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На версе феадальнай піраміды знаходзіўся *вялікі князь,* а ніжэй — *князі.* Памеры іх уладанняў былі надзвычай вялікімі, яны часам пераўзыходзілі заходнееўрапейскія герцагствы і графствы. Некаторыя *магнаты* (буйныя землеўласнікі) выстаўлялі ад колькасці сялянскіх "служб" на вайну больш конных воінаў, чым цэлыя паветы. Да іх адносяцца князі Радзівілы, Осцікавічы, Хадкевічы, Храптовічы, Алелькавічы. Так, Юрый Алелькавіч Слуцкі выстаўляў 433 коннікі, Канстанцін Астрожскі — 426. У 1567 г. налічвалася 16 магнатаў, якім належалі маёнткі на Беларусі, з іх 9 чалавек — беларускага паходжання. Князі, паны ў сваёй дзейнасці абапіраліся не толькі на вялікія землеўладанні і на перавагі гэтага землеўладання, а таксама і на свае саслоўныя прывілеі.

Старажытнае баярства таксама валодала вотчынамі. Дакументы тых часоў заўсёды адзначалі прывілеяванае становішча князёў, паноў і буйных баяраў.

Побач з магнатамі ў ВКЛ было шмат дробных землеўласнікаў, якія складалі служылы стан. Яны называліся *баярамі,* потым увайшлі ў склад шляхты. Гэта былі свабодныя ваеннаслужылыя людзі, якія напачатку не бралі ўдзелу ў палітычным жыцці. Шляхта паступова набывала ўсё большыя і большыя правы.

Феадальную "піраміду" (або "лесвіцу") сацыяльных груп у Вялікім княстве Літоўскім можна паказаць на такой схеме:

**Феадальная "лесвіца"**

Вялікі князь
князі, паны, баяры-шляхта
шляхта-васалы

Праграма дае магчымасць студэнту даведацца аб саслоўных правах феадалаў і рознага роду прывілеях феадальнай арыстакратыі (князёў, паноў) у XV—XVI стст. Працуючы з камп'ютэрам, навучэнец можа самастойна атрымаць тлумачэнне па кожнай сацыяльнай групе як феадалаў, так і сялян. Характарыстыка іх і некаторых з імі звязаных паняццяў даецца ніжэй.

***Князі*** — прадстаўнікі радавітай арыстакратыі (нашчадкі Рурыкавічаў, Гедзімінавічаў і іншых княжацкіх родаў), якія валодалі вялікай пазямельнай маёмасцю.

Князі маглі атрымаць ад вялікага князя асабістыя прывілеі: 1) права будаваць замкі; 2) збіраць пошліны з тавараў; 3) права



на трыманне корчмаў; 4) наладжваць у сваіх маёнтках таргі, кірмашы; 5) даваць сваім гарадам магдэбургскае права; 6) падлягалі суду толькі вялікага князя.

Ваенную службу яны адбывалі як правіла пад уласнай харугвай, маглі быць запрошанымі на соймы велікакняжацкімі лістамі.

***Паны*** — феадалы, якія займалі важныя пасады ў дзяржаўным апараце. Польскі тытул "пан" пачаў прымяняцца ў Вялікім княстве Літоўскім на пачатку XV ст. у адносінах да феадалаў, якія былі на дзяржаўнай службе. Затым ён пашырыўся на некаторых буйных землеўласнікаў, якія займалі важныя пасады ў дзяржаўным апараце і мелі сваіх васалаў. Гэты тытул перадаваўся па спадчыне. У сувязі з развіццём шляхецкай дэмакратыі да сярэдзіны XVI ст. гэты тэрмін ужо пачаў абазначаць усіх шляхціцаў, якія мелі прыгонных сялян.

***Баяры*** — ваенна-служылыя людзі ў Полацкім княстве і Вялікім княстве Літоўскім. У XIII—XVI стст. большасць баяр атрымлівала саслоўныя прывілеі феадалаў. Частка з іх (баяры панцырныя) складала прамежкавую групу паміж феадаламі і сялянамі. У юрыдычных дакументах XV ст. сярод баяр вылучаюцца паны і знатныя баяры, якія разам з князямі з'яўляліся вярхамі феадальнага саслоўя. У XIV—XV стст. асноўная маса феадалаў (сярэднія і дробныя землеўласнікі) мела назву "баяры".

З выданнем Гарадзельскага прывілея 1413 г. усё часцей пашыраюцца польскія назвы феадалаў — ***"шляхціцы"***, ***"зямяне"***.

Слова ***шляхта*** паходзіць ад старажытнанямецкага slahta, што азначае род, парода. Шляхціцы за валоданне зямлёй павінны былі несці ваенную службу пад харугвамі вялікага князя або буйнога землеўласніка, удзельнічаць у "паспалітым рушэнні". На феадальнай "лесвіцы" ВКЛ шляхта займала асобае месца. Усе шляхціцы юрыдычна мелі аднолькавыя правы. Аднак адны былі васаламі гаспадара, а другія — васаламі князёў і паноў. Шляхціц меў шэраг палітычных і асабістых правоў: не мог быць пазбаўлены свабоды без суда; быў вольны распараджацца сваёй маёмасцю; мог свабодна распараджацца сабой (паступіць на службу да прыватнай асобы, паехаць за мяжу, пераехаць у іншае месца краіны); меў права выбіраць і быць выбраным у органы кіравання; карыстаўся правам мець свой герб і інш.

У сярэдзіне XVI ст. колькасць шляхты (феадалаў), што мела землі на Беларусі, складала каля 162 тыс. чалавек (9% усяго на-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

сельніцтва Беларусі, якога налічвалася прыблізна 1,8 млн. чалавек). Гэта былі ў асноўным феадалы беларускага паходжання.

У XVI ст. з'явілася і *засцянковая шляхта.* Засценкі ўзніклі ў выніку ажыццяўлення "Уставы на валокі" (1557 г.). Рэформа ўвяла трохпольны севазварот, паводле якога ўся сялянская зямля разбівалася на тры полі з вызначанымі межамі ("сценамі"). Пасля межавання заставаліся адрэзкі — засценкі, якія здаваліся ў арэнду дробнай шляхце. Яна будавала свае сялібы. Гэтыя паселішчы шляхты таксама называліся засценкамі.

У ВКЛ невялікая частка шляхты насіла назву — *дваранства.* Яно было на службе пры двары вялікага князя або магната. Дваране ахоўвалі гарады і замкі, суправаджалі пасольствы, выконвалі судовыя рашэнні і г. д.

Такім чынам, шляхта — прывілеяванае саслоўе ў ВКЛ і Каралеўстве Польскім ў XV— канцы XVIII стст.

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі беларуская шляхта атрымала правы расійскага дваранства.

***Землеўладанні вышэйшага духавенства мелі карпаратыўны характар.*** Землі належалі ***епіскапству, манастырам*** і ***цэрквам.*** Аднак царкоўныя зямельныя ўладанні, у параўнанні з зямельнымі ўладаннямі свецкіх феадалаў (князёў, паноў і шляхты), не былі такія значныя ў разглядаемы перыяд.

## Сяляне

***Сяляне*** — шматлікі клас дробных вытворцаў, якія вялі індывідуальную гаспадарку на зямлі ўласнымі сродкамі вытворчасці і сіламі сваёй сям'і.

У залежнасці ад таго, на чыёй зямлі жылі сяляне, у дакументах і літаратуры іх называюць *гаспадарскімі (дзяржаўныя), прыватнаўласніцкімі (княжацкія, панскія, баярскія), духоўнымі (царкоўныя)* і інш.

Па спосабу набыцця сялян феадаламі яны падзяляліся на *спадкавыя* (дзедзічныя, атчызныя сяляне, атрыманыя ў спадчыну); *людзі даныя, выслужаныя, купленыя, закупныя* (атрыманыя як заклад за пазыку).

Гісторыю сялянства Беларусі ў складзе Вялікага княства Літоўскага вучоныя падзяляюць на два перыяды: 1) XIII—сярэдзіна XVI стст. (да валочнай памеры); 2) сярэдзіна XVI—XVII стст. У першы перыяд пераважала натуральная гаспадарка, і грашова-таварныя адносіны аказвалі тады малы ўплыў на развіццё сельскай гаспадаркі (як сялянскай, так і шляхецкай, панскай). Да XVI ст. большасць сялян плаціла даніну (дзякла) вырабамі сельскай гаспадаркі і промыслаў, а ў XVI ст. пачала шырока выкарыстоўвацца рэнта грашыма і паскорыўся перавод сялян (пераважна ў другой палове XVI ст.) на працоўную павіннасць *(паншчыну).*



Ва ўмовах панавання натуральнай гаспадаркі сяляне заставаліся асабіста вольнымі, "пахожымі", а таму ў пошуках лепшай долі яны пры выкананні пэўных умоў мелі права пераходзіць з маёнтка аднаго феадала ў маёнтак другога. У XV–XVI стст. па характару асабістай залежнасці ад феадала згадваюцца 4 катэгорыі насельніцтва:

1) *"людзі пахожыя", або вольныя;*
2) *"людзі непахожыя", або "атчызныя" ("отчычы");*
3) *"чэлядзь нявольная" (рабы);*
4) *закупы.*

***"Людзі пахожыя"*** — сяляне, якія мелі права пераходу ад аднаго феадала да другога. Яны плацілі даніну землеўласніку натурай і грашыма за надзелы зямлі, якімі карысталіся. Вялікія князі раздавалі панам землі, на якіх сядзелі "пахожыя" сяляне. Такім чынам, яны трапілі пад апеку прыватных уладальнікаў і залежалі ад паноў эканамічна, але захоўвалі за сабой права пераходу на зямлю іншага феадала. Іх нельга было перадаваць у спадчыну, дарыць.

***"Людзі непахожыя"*** — сяляне, якія страцілі волю, і належалі ўладальніку на аснове вотчыннага права, не мелі права пакінуць яго і ў залежнасці ад павіннасцей падзяляліся на цяглых, асадных і інш.

Фармальна "непахожы" селянін мог стаць вольным, калі заплаціць пану 10 коп (600) грошаў і аддасць атрыманую ад яго дапамогу, а той згаджаўся яго адпусціць. Аднак такіх грошай прыгонны звычайна не меў. (Для параўнання адзначым, што падчас прыняцця Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г. карова каштавала 100 грошаў).

Ніжэйшае сацыяльнае становішча займала ***"чэлядзь нявольная",*** або ***"чэлядзь дворная" (рабы).*** Гэта сяляне, якія самі прадаліся ў няволю, а таксама палонныя. Аднак заканадаўства абмяжоўвала рабства, а Статут ВКЛ 1588 г. фактычна адмяняў яго. "Чэлядзь нявольная" злілася з прыгонным сялянствам. Аднак становішча прыгонных сялян было блізкае да рабскага. Яны не мелі грамадзянскіх і палітычных правоў.

***Закупы*** — людзі, якія да выплаты атрыманай пазыкі знаходзіліся ў залежнасці ад феадала. Пры спробе ўцячы ператвараліся ў "чэлядзь нявольную".

Запрыгоньванне сялян доўжылася на працягу 100—140 гадоў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР

**Храналогія запрыгоньвання сялян**
**у Вялікім княстве Літоўскім**

**XIII—XV стст.** — канцэнтраванне зямельнай уласнасці ў руках феадалаў і ўзмацненне гаспадарчай залежнасці сялян ад іх.

**1447 г.** — прывілей Казіміра паклаў пачатак заканадаўчаму афармленню прыгоннага права. Забараняў феадалам прымаць збеглых, "чужых" сялян, дазваляў феадалам суд над залежным насельніцтвам.

**1468 г.** — Судзебнік (Статут) Казіміра. Сяляне пазбаўляліся права свабоднага адыходу ад феадала, што было замацавана ў артыкуле 24, які прадугледжваў суровае пакаранне асоб, што садзейнічалі ўцёкам "чэлядзі нявольнай" і залежных сялян.

**XVI ст.** — увядзенне люстрацый (рэвізій) угоддзяў і маёнткаў. Праводзіліся праз кожныя 5 гадоў. Гэта давала больш магчымасці і дзяржаве і феадалам дакладна ўлічваць колькасць зямлі і працоўных, што садзейнічала павелічэнню феадальных павіннасцей і прымацаванню сялян да зямлі пэўнага феадала.

**1529 г.** — Статут Вялікага княства Літоўскага абвяшчаў захаванне прывілеяў для феадалаў. Дазвалялася на працягу 10 гадоў вяртаць збеглых "непахожых людзей" (раздзел VII, артыкул 27).

**1557 г.** — паводле "Уставы на валокі", уведзенай Жыгімонтам Аўгустам, распачата аграрная рэформа (валочная памера), якая пашырала фальваркова-паншчынны спосаб гаспадарання. У выніку яе правядзення многія сяляне сталі прыгоннымі. Па гэтаму закону ўсе землі сялян прызнаваліся ўласнасцю феадала.

**1588 г.** — Статут Вялікага княства Літоўскага канчаткова юрыдычна прымацаваў большасць сялян да зямлі. Яны сталі прыгоннымі ("людзі непахожыя").

Феадалы пры дапамозе дзяржавы запрыгоньвалі сялян рознымі эканамічнымі і юрыдычнымі спосабамі.

Селянін, які больш за 10 гадоў пражыў на зямлі шляхціца, лічыўся яго ўласнасцю. Феадал меў права на працягу 20 гадоў адшукваць і вяртаць сваіх прыгонных сялян, якія ад яго ўцяклі, а дваровую і палонную чэлядзь і іх дзяцей можна было адшукваць і вяртаць без абмежавання тэрміну (раздзел XII, артыкул 12).

*Такім чынам, у XV—XVI стст. у Вялікім княстве Літоўскім усталявалася прыгоннае права.*

***Прыгоннае права*** *— гэта сістэма юрыдычных норм, якія замацоўвалі пазямельную, судовую і асабістую (пазаэканамічны прымус) залежнасць сялян ад феадалаў і дзяржавы; найбольш цяжкая форма залежнасці сялян пры феадалізме. Прыгонныя надзяляліся зямлёй, за што выконвалі на карысць феадала павіннасці і абсалютна пазбаўляліся палітычных правоў.*



Прапануем увазе студэнтаў вытрымкі з раздзела XII Статута ВКЛ 1588 г.

**Дакумент**

*Артыкул 11.*

Человек волный за кождый выступ* в неволю выдан быти не мает.

*Артыкул 12.*

О человеку отчызном.

... Пакли ж бы тот человек отчызный, отшедши от пана своего и мешкал далеко в десяти або в колкодесят миль, а пан его, о нем ведаючы, а через двадцать годов не поискивал его, тот вжо вечне о того человека молчати мает. ... Вед же челедь дворная отчызная або полоненая, которая бы от панов своих утекла, против тое паном их ани далекость местца, ани давность помененая ку отисканью правом слушным вадити и перескажати не мает против самых и детей их.

*Артыкул 13.*

О заседанью давности человека прихожого волного.

К тому уставуем, естли бы который человек стану простого, боярин або тяглый, будучи волным, похожим, а не отчычом чыим, зашедшы за кого с князей, панов, шляхты, будь запоможенье от того пана взявшы або не взявшы, а десеть лет за тым паном заседел, таковый человек або дети его, похочут ли проч отыйти, повинни будуть откупитися з службы десетма копами грошей и то все, што будуть у пана того своего запоможенье взяли, заплатити ... А где бы ближей десети лет пан такого збега где постигнул, тот вжо мает быти сказан и присужон тому пану за отчыча.

*Артыкул 17.*

Яко челядь дворная або полоненая утеклая мает быти заповедана и выдавана.

*Артыкул 20.*

Хто бы в голод челядь свою выгнал.

Теж уставуем: естли бы хто в голод челядь свою неволную выбил з дому проч не хотечи их кормити и переховывати, и тая челядь сама себе в голод перекормила, таковые вжо не мають быти невольные, але вольными.

* Выступ – злачынства, учынак, правіннасць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Артыкул 21.*

Неволники якие быти мають.

Неволники вперед не мають быти з иншых причин, одно полоненики, а иншая челядь не волная и теж дети, потомки полонеников мають быти осаживаны на землях и розумены быти за отчичов.

*"Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі" (Мн., 1989, сс. 316, 317, 320—322).*

Прыведзеныя вытрымкі з дакумента сведчаць, што запрыгоньванне сялян на працягу XVI ст. выклікала класавыя канфлікты. Сяляне выказвалі пратэст, уцякалі ад феадалаў, рознымі спосабамі змагаліся з вялікакняжацкай адміністрацыяй і прыватнымі землеўладальнікамі, якія павялічвалі сялянскія павіннасці.

**Сялянскія павіннасці**

У XIII—XV стст. адзінкамі абкладання павіннасцямі і падаткамі насельніцтва былі *дварышчы, службы, грамада, дымы.*

***Дварышча (дворышча)*** — абшчынная гаспадарчая арганізацыя, паселішча сваякоў, якое складалася з некалькіх сем'яў (5—6 дымоў).

***Грамада*** — сельскае пазямельнае аб'яднанне жыхароў адной вёскі, суседская сялянская абшчына. Члены сельскіх і валасных абшчын (валашчане) неслі калектыўную адказнасць за спраўнае выкананне ўстаноўленых павіннасцей. Абшчыннае землекарыстанне было падарвана валочнай памерай, якая ўводзіла падворнае землекарыстанне. Аднак *сябрыны* — народны звычай сумеснага карыстання пашай, сенажаццю, пчоламі, жывёлай і г. д. — захаваліся на Беларусі аж да XX ст. Былі найбольш пашыраны ў XIV—XVI стст. на поўдні Беларусі. Саўладальнікаў маёмасці называлі *сябрамі.* Сябры сумесна адказвалі за выкананне феадальных павіннасцей.

***Служба*** — 1) зямельны ўчастак, які з'яўляўся адной з асноўных адзінак абкладання сялян феадальнымі павіннасцямі ў Вялікім княстве Літоўскім да валочнай памеры; 2) адзінка абкладання, якая бралася пад увагу пры выстаўленні шляхтай коннага войска. Звычайна служба знаходзілася ва ўладанні прыкладна 2—3 дымоў.

***Дым*** — адзінка падаткаабкладання і павіннасцей. Атаясамліваўся з гаспадаркай селяніна, ачагом (дымам). На дым прыходзілася ў сярэднім каля 10,6 га розных зямельных угоддзяў.



Асноўнымі вытворчымі адзінкамі ў XVI ст. з'яўляліся сялянскія гаспадаркі *(дымы)* і ***фальваркі*** феадалаў, а адзінкамі падаткаабкладання і павіннасцей сялян—***дым, саха, валока.***

***Саха*** — адзінка падатковага абкладання ў залежнасці ад колькасці рабочай жывёлы (валоў, коней). Соймы ВКЛ 1534 г. і 1540 г. вызначалі для ўсяго насельніцтва падатак на войска (серэбшчыну) з кожнай валовай сахі па 12 грошаў, з конскай — 6 грошаў.

Там, дзе была праведзена валочная памера, павіннасці вызначаліся ад валокі зямлі. ***Валока*** — асноўная зямельная мера (30 моргаў, або 21,36 га) і адзінка абкладання павіннасцямі сялян. Валочная памера, або аграрная рэформа, праводзілася з канца 1530-х гг. да сярэдзіны XVII ст. з мэтай павелічэння даходаў феадалаў шляхам уладкавання землекарыстання і уніфікацыі феадальных павіннасцей. Яна была ажыццёўлена на вялікакняжацкіх і прыватнаўласніцкіх землях заходняй і цэнтральнай Беларусі. У выніку гэтай рэформы павялічылася колькасць фальваркаў.

***Фальварак*** — двор феадала (з комплексам будынкаў) і яго зямля, якая апрацоўвалася прыгоннымі сялянамі, а атрыманая прадукцыя ішла на продаж. Паводле "Уставы на валокі", для апрацоўкі адной валокі фальварковай зямлі вызначалася 7 валок сялянскай зямлі, г. зн. валоку панскай зямлі апрацоўвалі сяляне з 7 валок зямлі.

***Двор*** — адміністрацыйна-гаспадарчы цэнтр маёнтка.

Камп'ютэрная праграма ўключае матэрыял аб формах і памерах сялянскіх павіннасцей. Студэнты могуць атрымаць пэўнае ўяўленне аб феадальнай эксплуатацыі беларускіх сялян у XVI—XVII стст. Праўда, неабходна падкрэсліць, што ў праграме даецца матэрыял не аб усіх павіннасцях і падатках. Падлік паказвае, што ў разглядаемы перыяд іх існавала каля 100. Канешне, не ўсе яны былі ў адным уладанні. На асобную сялянскую гаспадарку прыпадалі некаторыя павіннасці, што паказаны ў нашай праграме. Пры гэтым адна з іх лічылася галоўнай, па якой вызначалася катэгорыя сялян.






РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Даніна*** – феадальная рэнта, якую плацілі сяляне натурай і грашыма.

***Дзякла*** — даніна прадуктамі феадалу за карыстанне зямлёй, асноўная форма феадальнай рэнты (падатку) да XVI ст. Аддавалася ў большасці збожжавымі (жыта, ячмень, авёс, пшаніца). Апрача таго, патрабавалася абавязкова даваць свайму пану прадукты харчавання — гусей, курэй, яйкі, масла, грыбы, ягады і інш.

***Асада*** — від феадальнай зямельнай рэнты ў грашовай форме, асноўная павіннасць асадных сялян ВКЛ у XVI ст. "Устава на валокі" 1557 г. вызначыла асаду ў 30 грошаў з валокі. У канцы XVI ст. асада злілася з чыншам.

***Чынш*** (польск. czynsz ад лац. census — перапіс) — грашовыя плацяжы феадальна-залежных сялян землеўладальніку за карыстанне зямлёй. У XVI ст. замяніў асаду і стаў асноўнай павіннасцю чыншавых сялян. Як дадатковую павіннасць чынш плацілі і іншыя сяляне за зямельны надзел. Калі селянін апрача асноўнага надзелу браў дадатковы, дык за яго плаціў асобна.

***Паншчына*** ("цяглая служба", "дзела") — дармавая абавязковая работа з уласнымі прыладамі працы на зямлі феадала. Паншчыну адпрацоўвалі ўлетку і зімой мужчыны і жанчыны. На працу сяляне выходзілі са сваёй рабочай жывёлай ці без яе. Памер паншчыны землеўласнік вызначаў асабіста, з улікам захавання для сялян часу, каб яны мелі магчымасць весці гаспадарку на сваім надзеле. У XVI ст. сяляне адпрацоўвалі паншчыну ў сярэднім па 2 дні на тыдзень з адной валокі.

У залежнасці ад таго, якая павіннасць лічылася галоўнай для сялян, былі вядомыя *цяглыя, асадныя* і *вольныя валокі*. З цяглай валокі сяляне адпрацоўвалі ў фальварку 102 дні ў год, а з асаднай плацілі феадалу 30 грошаў. Вольныя валокі даваліся сялянам-слугам, якія вызваляліся ад феадальных павіннасцей.

Віды іншых асноўных павіннасцей (чынш, дзякла) як з цяглай, так і з асаднай валокі былі аналагічныя, але адрозніваліся памерам у залежнасці ад якасці зямлі. Пасля правядзення валочнай памеры феадальныя павіннасці сялян вызначаліся на валоку: паншчыны ад 2 да 4—5 дзён у тыдзень, асады — ад 60 да 120 грошаў, дзякла – 1–2 бочкі збожжа, талок — ад адсутнасці іх да 12 дзён у год.

Умоўную мяжу паміж фальваркова-паншчынным і даннікa-дольніцкім варыянтамі эксплуатацыі з аднаго боку, і чыншавым — з другога, можна правесці па лініі Пінск—Слуцк—Менск—Барысаў—Орша. Асадныя валокі пераважалі ў гаспадарскіх маёнтках, якія знаходзіліся на паўднёвым усходзе Беларусі.

Сяляне выконвалі і дадатковыя павіннасці: *адпрацовачныя* і *грашовыя.*






***Талака*** — народны звычай калектыўнай працы, які быў выкарыстаны феадаламі для прыцягнення сялян да тэрміновай прымусовай працы (згоны) звыш цягла (паншчыны) ў час жніва, касьбы, ворыва. У некаторых мясцінах праводзілася да 12 талок у год, у якіх удзельнічалі ўсе працаздольныя члены кожнай сям'і.

***Гвалты*** — пільныя неаднакладныя работы, выкліканыя стыхійнымі бедамі, паводкамі, пажарамі і г. д.

***Укол*** — павіннасць сялян па рамонце дзяржаўных замкаў. Паводле Статута ВКЛ 1588 г. (раздзел III, артыкул 29), сяляне княжацкія, панскія і шляхецкія (апрача гаспадарскіх) ад яе вызваляліся.

***Шарваркі*** — рамонт і будаўніцтва розных дарог, мастоў, будынкаў у маёнтку. Іх памер не быў пастаянны і даходзіў да 24 рабочых дзён у год з сялянскага двара.

***Падводная павіннасць*** — падвоз сялянамі панскіх грузаў у гандлёвыя цэнтры (гарады і мястэчкі) на сваёй жывёле. Іншы раз гэтая павіннасць замянялася падарожчынай (выплатай феадалу пэўнай колькасці грошай).

Паводле выканання сялянамі асноўных павіннасцей і забяспечанасці зямлёй, у XVI ст. іх падзяляюць на некалькі катэгорый.

**Катэгорыі сялян паводле іх павіннасцей**






РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

***Валяне*** (слабодзічы, новікі) — сяляне, якія ў сувязі з асваеннем цаліны часова вызваляліся ад павіннасцей.

***Даннікі*** — найбольш пашыраная катэгорыя феадальна-залежных сялян у XIV—XV стст., якія плацілі феадалу (пераважна вялікаму князю) зямельную рэнту ў форме даніны (прадукцыя сельскай гаспадаркі і палявання). З развіццём таварна-грашовых адносін і стварэннем фальваркаў феадалы пераводзілі іх у разрад асадных або цяглых сялян. У сярэдзіне XVI ст. яны пераважалі ў Падняпроўі і Падзвінні. Падаткі і зборы, якія ўносіліся сялянамі-даннікамі, захоўвалі старадаўнія назвы, такія, як *даніна, палюддзе, куніца, сярэбшчына, стацыя*.

Асобную групу даннікаў складалі дольнікі.

***Дольнікі (здольнікі)*** — сяляне, якія плацілі феадалу 1/4 частку сабранага ўраджаю. Дольнікі ў сярэдзіне XVI ст. былі адной з асноўных катэгорый сялянства Падзвіння.

***Асадныя*** — феадальна-залежныя сяляне ў XVI ст., галоўнай павіннасцю якіх была асада, апрача таго яны давалі дзякла і стацыю натурай або грашыма. У канцы XVI ст. адносіліся да чыншавых сялян.

Агульная вартасць асноўных павіннасцей у грашовым выражэнні складала з асаднай валокі добрай зямлі 106 грошаў, а з вельмі дрэннай — 66.

***Чыншавыя сяляне*** — катэгорыя феадальна-залежных сялян у XV—XVIII стст., якія плацілі землеўладальнікам грашовую рэнту (чынш) за карыстанне зямлёй, што замацоўвалася за імі і перадавалася па спадчыне. Выконвалі і іншыя павіннасці (дзякла, талака, гвалты) на карысць феадала. Чыншавых сялян іншы раз называлі *кунічнікамі,* бо грашовую рэнту ў некаторых мясцовасцях называлі *кунай, куніцай.*

***Цяглыя (прыгонныя) сяляне*** — феадальна-залежныя сяляне, галоўнай павіннасцю якіх была паншчына. Катэгорыя цяглых сялян узнікла у XV ст. у сувязі з рэарганізацыяй панскай дваровай гаспадаркі ў фальварак. У цяглых сялян ператвараліся даннікі, калі даніна прадукцыяй сялянскіх гаспадарак замянялася адпрацовачнай рэнтай і грашыма. Да валочнай памеры адзінкай абкладання цяглых сялян была "служба", пасля аграрнай рэформы — валока зямлі.

У XV ст. з развіццём таварна-грашовых адносін і павелічэннем на рынках попыту на сельскагаспадарчыя прадукты пачалася рэарганізацыя гаспадаркі феадалаў: частка сялян пераводзілася з даніны на паншчыну, а другая частка — з даніны на грашовыя плацяжы (асаду або чынш). *Пастунова асноўнымі катэгорыямі сталі цяглыя і асадныя сяляне.*



Апрача названых катэгорый па ступені забяспечанасці зямлёй і сродкамі вытворчасці адрозніваюць "людзей лёзных", агароднікаў, бабылёў (кутнікаў), падсуседзяў.

***"Людзі лёзныя"*** — асобы без пэўных абавязкаў і пастаяннага месцапражывання, не займаліся карыснай працай.

***Агароднікі*** — сяляне, якія пасяліліся на невялікіх дзялянках зямлі і выконвалі вызначаныя павіннасці. Паводле "Уставы на валокі", агароднікам давалі па 3 моргі (каля 2 га) зямлі і сялілі іх паблізу фальваркаў у вёскі па 10—20 двароў. За зямельны надзел агароднікі адпрацоўвалі без каня ў маёнтках 1 дзень у тыдзень, а іх жонкі — 6 дзён за лета.

***Бабылі (кутнікі, халупнікі)*** — катэгорыя залежных беззямельных сялян у XVI—XIX стст. Некаторыя мелі хаты, жывёлу, часам агароды, а іншыя нічога не мелі і жылі ў чужых хатах, займаючы кут або камору. Асноўнай павіннасцю была *бабыльшчына* — грашовы чынш (ад 1 да 4 1/2 злотых у год). *Падсуседзі* — беззямельныя сяляне, якія жылі на чужых дварах.

Адной з катэгорый феадальна-залежных сялян у XV—XVIII стст. былі ***сяляне-слугі,*** асноўным абавязкам якіх была вайсковая служба або выкананне павіннасцей, што патрабавалі спецыяльных навыкаў. Сяляне-слугі былі ў дзяржаўных, шляхецкіх і царкоўных уладаннях. Сацыяльны статус іх быў больш высокі, чым іншых катэгорый сялян. Аднак і сярод сялян-слуг сустракаліся як свабодныя ("пахожыя"), так і прыгонныя.






РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Асочнікі*** ахоўвалі пушчу вялікага князя або магната і ўдзельнічалі з ім у паляванні.

***Бабро̆ўнікі*** — сяляне, абавязкамі якіх былі паляванне на бабро̆ў, здабыча футра і ахова бабро̆ў.

***Рыкуння*** – служанка, якая даглядала каро̆ў у велікакняжацкім маёнтку.

Апрача асноўных павіннасцей сяляне выконвалі шмат дадатковых, якія вызначаліся традыцыямі і самім феадалам. Сярод дадатковай даніны было *мезлева* (мяса, яйкі, мёд, футра). Вядомы былі і святочныя паборы (*валачобнае* і *каляднае*), калі перад Вялікаднем і Калядамі сяляне абавязаны былі здаваць свойскую птушку і яйкі на панскі двор. Сяляне часта выконвалі больш павіннасцей, чым было вызначана інвентарамі. За нявыхад на паншчыну або невыкананне іншых павіннасцей без уважлівых прычын селяніна каралі — штрафавалі грашыма, павялічвалі колькасць дзён паншчыны, білі бізуном і г. д.

У канцы XVI і ў XVII ст. як асноўныя, так і дадатковыя павіннасці сялян павялічваюцца. Іх колькасць расце, і яны атрымліваюць розныя мясцовыя назвы. Зразумела, не ўсе яны выконваліся адной сялянскай сям'ёй.

Сяляне выконвалі не толькі павіннасці для пана, але плацілі і ўрадніку. Так сяляне-даннікі вёскі Гняздзілавічы Ашмянскага павета пасылалі на панскі двор улетку 9 чалавек касіць сена на працягу 8 тыдняў, а ўвосень і вясной па 3 чалавекі з сякерамі будаваць будынкі на панскім двары. Адпраўляючыся на гэтыя работы, даннікі плацілі ўрадніку па 2 грошы "пасякершчыны" ад кожнай сякеры і па грошу "закоснага" ад кожнай касы. Яны ж плацілі ўрадніку, які прыязджаў за данінай, "цівуншчыну" (прадуктамі) і "пішчае" (грашыма).

Аднак у тыя часы ўраджайнасць збожжавых была нізкая — "сам—3", г. зн. каля 4 цэнтнераў з гектара. Таму і свецкія феадалы, і дзяржаўная казна, і царква былі зацікаўлены ў павелічэнні сваіх даходаў грашыма. У XV—XVI стст. натуральная гаспадарка саступае месца таварна-грашовым адносінам. Гарадскія жыхары і сяляне ўцягваюцца ў таварна-рынкавыя адносіны. Павялічваецца колькасць розных грашовых збораў, якія плацяць сяляне землеўласніку і ў велікакняжацкую казну.



**Грашовыя падаткі і зборы ў XV—XVI стст.**

*Дзяржаўныя павіннасці:*
- сярэбшчына
- чоп (капшчына)
- палюддзе
- стацыя

*Панскія павіннасці:*
- куніца вывадная
- угайнае
- пастожнае
- маставое
- жарнавое
- падарожчына

Налічваюць 56 грашовых пабораў, сярод якіх рагавое, адкладнае, быкавое, тміннае і інш.

Апрача шэрага павіннасцей на карысць землеўласніка (феадала), сяляне выконвалі нямала розных павіннасцей і пабораў на карысць дзяржавы: сярэбшчына, палюддзе, укол, стацыя, чоп, шарваркі (мастоўшчына).

***Сярэбшчына*** — надзвычайны дзяржаўны грашовы падатак на ваенныя мэты.

***Чоп (чопавае, капшчына)*** — грашовы падатак за дазвол на выраб і продаж алкагольных напіткаў.

***Палюддзе*** — даніна, якую ў XV—XVI стст. насельніцтва аддавала намеснікам або княжацкім старостам пры аб'ездзе імі валасцей.

***Стацыя*** — павіннасць сялян і мяшчан на ўтрыманне вялікага князя, яго паслоў і ганцоў у час іх праезду па дадзенай мясцовасці, на ўтрыманне часова размешчанага тут войска.

***Куніца вывадная (кунічнае)*** — грашовая плата за дазвол выйсці замуж у іншую воласць.

***Угайнае (вепраўшчына)**** — грашовая плата за карыстанне ляснымі ўгоддзямі зямельных уласнікаў.

***Маставое*** — плата за праезд цераз мост, грэблю.

***Жарнавое*** — грашовы збор за карыстанне млынам.

* Угайнае, жарнавое і рыбнае — гэта плата за карыстанне чужой маёмасцю (сервітуты).



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

***Падарожчына*** – грашовая плата, якая замяняла падводную павіннасць.

У XVII ст. асноўным дзяржаўным падаткам стала ***падымнае***. Адзінкай абкладання быў дым. Стаўка аднаго падымнага складала 15 грошаў (па Статуту ВКЛ 1588 г. 15 грошаў каштавала авечка). Падатак уведзены на Беларусі ў 1649 г.

Неабходна яшчэ мець на ўвазе, што дакументы, па якіх галоўным чынам мяркуецца аб сялянскіх павіннасцях, не заўсёды даюць аб'ектыўную карціну сапраўднага феадальнага ўціску. Дакументы вызначалі нормы павіннасцей, але гэтыя нормы паўсюдна парушаліся арандатарамі і адміністрацыяй маёнткаў. І вельмі часта фактычныя павіннасці прыгонных былі значна вышэйшыя ў параўнанні з інвентарнымі. Напрыклад, паншчына за 150 гадоў (з пачатку XV да сярэдзіны XVI стст.) з 14 дзён у год з валокі зямлі павялічылася да 104 дзён (2 дні ў тыдзень), г. зн. у 7,4 раза.

Беларускі селянін быў практычна безабаронны перад жорсткасцю і самавольствам свайго пастаяннага ці часовага пана-ўладальніка, што прыводзіла да розных форм класавай барацьбы.

**Формы пратэсту і класавай барацьбы сялян:**

— скаргі пану на адміністратараў;

— скаргі панам-рады і вялікаму князю на землетрымальніка;

— адмова ад выканання павіннасцей;

— наўмысныя парубкі лесу, патрава пасеву і сенажацей на землях уладальнікаў;

— уцёкі прыгонных ад сваіх уладальнікаў;

— забойствы панскіх слуг;

— забойствы саміх гаспадароў;

— сялянскія бунты.

Асабліва частымі былі крадзяжы ў гаспадарскім і панскім лесе. Сялянам патрэбны былі дровы і будаўнічыя матэрыялы, купіць якія яны не заўсёды маглі. Пазней нават з'явілася прымаўка: "Хто ў лесе не злодзей — той дома не гаспадар".

Можна зрабіць высновы, што з дапамогай камп'ютэрнай праграмы студэнты яскрава змогуць уявіць, з якіх слаёў складалася земляробчае насельніцтва ВКЛ, высветліць ўмовы карыстання пэўнымі ўчасткамі зямлі. На наш погляд, матэрыял, змешчаны ў праграме пра комплекс павіннасцей і падаткаў, якія выконваліся сялянамі за карыстанне зямлёй, і розных пабораў з іх, дае магчымасць студэнтам зразумець сутнасць феадальнай эксплуатацыі сялян у XIV—XVI стст.



## Мяшчане

У разглядаемы перыяд хуткімі тэмпамі ідзе развіццё гарадоў, павялічваецца колькасць гарадскога насельніцтва. Аб яго структуры дае ўяўленне наступная табліца.

**Сацыяльны склад гарадскога насельніцтва**

МЯШЧАНЕ

| купцы (прасолы) | госці | гандляры | рамеснікі (майстры) | "чорныя людзі" |
|---|---|---|---|---|

Паводле саслоўнай прыналежнасці, правоў і прывілеяў, гараджане ўяўлялі сабой даволі стракатую групу насельніцтва. Вылучаліся багатыя купцы, гандляры, майстры.

***Купцы*** — прывілеяваная група багатых мяшчан, якія займаліся гандлем, з'яўляліся пасрэднікамі паміж вытворцамі і спажыўцамі. ***Госці*** — багатыя купцы, якія займаліся замежным гандлем. Купцоў, якія не выязджалі за межы княства, называлі *прасоламі*. Адначасова з гандлем купцы займаліся ліхвярствам і водкупам.

***Гандляры (перакупшчыкі)*** — група гарадскога і мястэчковага насельніцтва, якая займалася пераважна мясцовым гандлем, не выязджаючы далёка за межы горада або мястэчка. Многія гандляры мелі свае крамы.

***Рамеснікі*** — непасрэдныя вытворцы пэўных вырабаў з дапамогай уласных прылад працы. Працавалі па заказу і на рынак. У сярэдзіне XVI ст. рамеснікі аб'ядноўваюцца ў цэхі. Паўнапраўныя ў цэхах былі ***майстры***, якія мелі свае майстэрні, дзе працавалі падмайстры і вучні. У Статуце 1566 г. рамеснікі падзелены на дзве катэгорыі: 1) арганіст, пушкар, маляр, кравец; 2) дойлід, каваль, сталяр, вознік (фурман), муляр, шавец, ганчар і інш. Так галоўшчына (штраф за забойства) за майстра першай катэгорыі складала 30 коп грошаў, а за майстра другой — 20 коп грошаў. У Статуце 1588 г. яны ўжо складаюць адну групу. Рамеснікаў, якія не ўваходзілі ў цэхі, называлі *партачамі*.

***"Чорныя людзі" (работнікі)*** — асноўная маса насельніцтва гарадоў ВКЛ у XV—XVI стст. — дробныя гандляры, простыя рамеснікі і іншыя групы працоўнага насельніцтва, як напрыклад, бабылі.

***Бабылі (кутнікі)*** — група бедных людзей, якія займаліся



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узнымі рамёствамі і промысламі, жылі ў чужых хатах, займаючы кут або камору. Яны ў саслоўе мяшчан не ўваходзілі.

Паводле маёмаснага становішча гарадскія жыхары падраздзяляліся на тры асноўныя групы: 1) заможныя купцы і ўласнікі буйных рамесных майстэрань; 2) дробныя гандляры і простыя рамеснікі; 3) "чорныя людзі" (наёмныя работнікі, вучні майстроў, хатняя прыслуга).

У буйных гарадах, якія атрымалі магдэбургскае права, апрача названых сацыяльных груп жылі паны, шляхта, ваяводскія і павятовыя ўрадаўцы, духоўныя асобы і іншыя сацыяльныя групы.

Гарады былі велікакняжацкія і прыватнаўласніцкія. І тыя і другія маглі атрымаць магдэбургскае права — права на гарадское самакіраванне. Каб карыстацца правамі мяшчан, трэба было атрымаць гарадское грамадзянства. Адзінага гарадскога грамадзянства ў дзяржаве не было. Перасяленец на новым месцы павінен быў зноў атрымаць яго (упісацца ў гарадскія кнігі і прынесці прысягу ўладару горада). У адрозненне ад насельніцтва велікакняжацкіх гарадоў жыхары прыватнаўласніцкіх захоўвалі сваё падданства ўладальніку горада — магнату.

У гарадах, што мелі гарадское самакіраванне, з пачатку XVI ст. і пазней сустракаліся *юрыдыкі.* Юрыдыкі — адміністрацыйна адасобленыя часткі гарадоў ці прыгарадаў (прадмесцяў), якія знаходзіліся пад уладай феадала, царквы або манастыра і на гэтых жыхароў не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада магістрата. У юрыдыкі феадалы перасялялі прыгонных сялян і слуг-рамеснікаў.

Мяшчане выконвалі дзяржаўныя павіннасці: падводную (падарожчына), стацыю, сярэбшчыну, ардыншчыну (збор грошай на ўладкаванне адносін з Крымскай і Нагайскай ордамі), падымнае (з 1649 г.).

Мы разгледзелі сацыяльную структуру насельніцтва ВКЛ. У прывілеяваным становішчы знаходзіліся прадстаўнікі служылага і духоўнага стану. Яны былі вольнымі людзьмі і карысталіся палітычнымі і эканамічнымі правамі. Князі, паны, епіскапы, шляхціцы мелі шмат правоў і прывілеяў, але зусім нямнога павіннасцей. Сярод людзей простага стану ў лепшым становішчы былі мяшчане, асабліва багатыя. Сяляне складалі вялікую групу насельніцтва, якое выконвала большасць усіх павіннасцей на карысць феадалаў і дзяржавы. Прававое становішча сялян было незайздросным, асабліва гэта тычыцца прыгонных, якія фактычна былі бяспраўныя. Пераход простых людзей у прывілеяваны стан шляхты быў магчымы ў выключных выпадках толькі для багатых мяшчан і сялян, якія неслі ваенную службу.

*Праграмны комплекс "Belarus" распрацаваны з мэтай стварэння камп'ютэрнага сродку навучання ў галіне гуманітарных*



*дысцыплін. Комплекс прадугледжвае далейшае развіццё гэтай тэмы і ўяўляе сабой псеўдагіпертэкставую сістэму, якая дазваляе фарміраваць і выкарыстоўваць у навучальным працэсе вучэбныя матэрыялы, прадстаўленыя ў выглядзе схем. Гэты комплекс выкарыстоўваецца ў Беларускім універсітэце культуры на занятках па гісторыі Беларусі.*

*Пры падрыхтоўцы матэрыялаў да ўводу ў базу дадзеных праграмнага комплексу трэба звярнуць асаблівую ўвагу на вызначэнне асобных паняццяў, падзей, фактаў і сувязей паміж імі. Асаблівасцю комплексу з'яўляецца магчымасць фарміраваць схемы розных ступеняў складанасці, уключаць тлумачэнні да іх. Пры неабходнасці на экране могуць быць сфарміраваны іншыя элементы, якія дапоўняць інфармацыю па гэтай тэме. Гэта могуць быць пытанні, заўвагі, метадычныя рэкамендацыі і іншае, неабходнае для арганізацыі навучальнага працэсу пры розных формах аўдыторнай і самастойнай работы.*

*Праграмны комплекс патрабуе мінімальных тэхнічных рэсурсаў. Для паспяховай работы дастаткова выкарыстоўваць ПЭВМ з 640 кВ RAM, дыскавай памяццю да 300 кВ, любым маніторам, працэсарам 8086 ці вышэй, DOS 3,3 і вышэй.*

**Пры падрыхтоўцы праграмы была выкарыстана наступная літаратура:**


Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стст. Мн., 1992.

Довнар-Запольский М.В. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах. Т.1. Киев, 1901.

Довнар-Запольский М.В. Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVI в. Киев, 1905.

Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

Козловский П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XII–XVIII вв. Мн., 1969.

Копысский З. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI–первой половине XVII в. Мн., 1975.

Лойка П. А. Прыватнаўласніцкія сяляне на Беларусі: Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XV–XVIII ст. Мн., 1991.

Любавский М.К. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания Первого Литовского Статута: Исторические очерки. М., 1892.

Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х ч. Ч.1. Мн., 1994.

Пичета В.И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. М., 1958.

Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Мн., 1960.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1588.: Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн., 1989.

Спиридонов М.Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV—XVI вв.). Мн., 1993.

Юхо Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ